НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ

УДК 947.6

**Шаўчэня Міхаіл Міхайлавіч**

# РАЗВІЦЦЁ ГАНДЛЮ Ў БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XVIII – ПЕРШАЯ ТРЭЦЬ XIX СТ.)

07.00.02 – айчынная гісторыя

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

Мінск - 2003

Праца выканана ва Установе адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы"

Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, прафесар Крэнь І.П., Установа адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы", кафедра гісторыі Беларусі

Афіцыйныя апаненты: доктар гістарычных навук, прафесар Люты А.М., Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка", кафедра гісторыі Беларусі

кандыдат гістарычных навук, дацэнт Каханоўскі А.Г., Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт", кафедра гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу

Апаніруючая арганізацыя – Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт"

Абарона адбудзецца "5" верасня 2003 г. у 16.00 гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Д01.40.01 у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г.Мінск, вул. Акадэмічная, 1; тэл. вучонага сакратара 284-18-39)

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я.Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі: г.Мінск, вул.Сурганава, 15.

Аўтарэферат разасланы "1" жніўня 2003 г.

Вучоны сакратар Савета па абароне дысертацый, кандыдат гістарычных навук, дацэнт В.В.Яноўская



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Канец XVIII – першая трэць XIX ст. – адзін з самых складаных і супярэчлівых перыядаў у гісторыі Беларусі. У ходзе трох падзелаў Рэчы Паспалітай у апошняй трэці XVIII ст. землі Беларусі былі ўключаны ў склад Расійскай дзяржавы. Гэта падзея не можа не выклікаць пільнай увагі гісторыкаў. Асэнсаванне яе немагчыма без вырашэння важнейшага пытання, якое праходзіць праз усю айчынную гісторыю канца XVIII – першай трэці XIX ст. – што дало эканоміцы беларускага рэгіёну ўключэнне яе ў структуру агульнарасійскага гаспадарчага механізма?

Састаўной часткай праблемы развіцця гандлю на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. з'яўляецца пытанне аб фарміраванні купецтва – арганізатара і кіраўніка гандлёвага працэсу. Як эканамічна ангажаваная частка насельніцтва, купецтва было цесна звязана з прамысловасцю і аб'ектыўна спрыяла яе развіццю. У руках гільдыйскіх гандляроў канцэнтраваліся значныя грашовыя сумы, якія інвесціраваліся не толькі ў гандлёвыя аперацыі, але і ў прамысловасць. Такім чынам, вырашыць пытанне аб фінансаванні гандлёвага і прамысловага прадпрымальніцтва магчыма толькі праз аналіз дзейнасці купецтва, яго капіталаў і крыніц іх накаплення.

Адной з перадумоў актуалізацыі гандлёвай тэматыкі ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі з'яўляецца недастатковае асвятленне яе ў гістарычнай літаратуры, адсутнасць грунтоўных абагульняючых прац па даследуемай праблеме, неабходнасць стварэння аб'ектыўнай канцэптуальнай базы па шэрагу ўзнятых пытанняў.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыя з'яўляецца ініцыятыўнай працай. Тэма зацверджана Саветам Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы (29.12.1997г. пратакол №5); на бюро навуковага Савета па праблеме "Гісторыя Беларусі" (30.10.1998г. пратакол №3).

**Мэта і задачы даследавання.** Зыходзячы з актуальнасці тэмы, яе недастатковай распрацаванасці, аўтар ставіць перад сабой мэту раскрыць у праблемна-храналагічным плане працэс развіцця гандлёвай сістэмы Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIXст. Для дасягнення мэты лічыць неабходным вырашыць наступныя задачы:

- прааналізаваць працэс фарміравання новай гандлёвай прасторы на землях Беларусі па меры ўключэння апошніх у структуру агульнарасійскага рынка;
- вызначыць прававое становішча, сацыяльны статус, колькасны састаў купецтва беларускіх губерняў, прааналізаваць памеры яго капіталаў і крыніцы іх накаплення;
- высветліць стан і тэндэнцыі развіцця ўнутранага рынка беларускага рэгіёну праз аналіз асноўных формаў арганізацыі таварна-грашовага абарачэння;
- акрэсліць таварную спецыялізацыю беларускіх губерняў, вызначыць іх месца ў сістэме міжрэгіянальнага гандлю Расійскай імперыі, даць характарыстыку знешнегандлёваму сектару беларускага рынка, супаставіўшы экспартныя і імпартныя таварныя патокі.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляюцца працэсы, якія адбываліся ў эканамічным жыцці Беларусі пасля далучэння беларускіх зямель да

Расіі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. У якасці прадмета даследавання разглядаецца развіццё гандлёвай сістэмы беларускага рэгіёна як сукупнасці пэўных элементаў (падсістэм): гандлёвай прасторы, суб'ектаў гандлёвай дзейнасці, унутранага, міжрэгіянальнага і знешняга тавараабмену.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** У метадалагічным плане даследаванне пабудавана на прынцыпах гістарызму і аб'ектыўнасці, прыярытэце дакументальных фактаў. У аснову асабістага аналіза пакладзена крытычнае вывучэнне, параўнанне і сінтэз інфармацыі першакрыніц, перакрыжаваная пераправерка дадзеных.

Практычным увасабленнем вышэйназваных метадалагічных прынцыпаў у працэсе даследавання сталі агульнанавуковая і спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны. Для апрацоўкі статыстычнага матэрыяла быў выкарыстаны таблічны метад.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Дысертацыя з'яўляецца першай спробай комплекснага аналізу гандлёвых адносінаў на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. на падставе наяўных пісьмовых крыніцаў. Аўтарам прапанавана мадэль гандлёвай прасторы, якая сфарміравалася ў выніку геапалітычных зменаў апошняй трэці XVIII ст. – падзелаў Рэчы Паспалітай і ўключэння тэрыторыі Беларусі ў арбіту агульнарасійскай гандлёвай палітыкі; асэнсавана палітыка расійскага самаўладдзя адносна купецкага саслоўя, пазначаны асаблівасці праватворчай дзейнасці ўрада ў дачыненні да яўрэйскіх гандляроў; прааналізаваны стан і вызначаны тэндэнцыі развіцця беларускага рынку ў разрэзе: ўнутраны, міжрэгіянальны і знешні тавараабмен.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі даследавання будуць садзейнічаць стварэнню цэласнай канцэпцыі айчыннай гісторыі і могуць быць выкарыстаны пры напісанні фундаментальных працаў па гісторыі Беларусі, распрацоўцы адпаведных курсаў па эканамічнай гісторыі Рэспублікі, а таксама ў выкладанні дысцыплін краязнаўства і этнаграфіі.

Даследаванне юрыдычнага статуса купецтва Беларусі, выяўленне хібаў і супярэчнасцяў арганізацыі гандлёвага працэсу ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. будзе спрыяць распрацоўцы ўзважанай, збалансаванай эканамічнай стратэгіі ў стасунку да гандлёва-прадпрымальніцкага корпуса сучаснай Беларусі.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.** Прапанаваныя ў даследаванні матэрыялы, на думку аўтара, дазваляць даказаць наступныя палажэнні:

1. Уключэнне беларускіх зямель у структуру агульнарасійскага рынка суправаджалася фарміраваннем новай гандлёвай прасторы на тэрыторыі тагачаснай Беларусі. Змест гандлёвай прасторы вызначаўся сукупнасцю сацыяльных (адносіны дзяржаўнага апарата да заняткаў гандлёва-пасрэдніцкай дзейнасцю; сацыяльны склад гандлёвага корпуса; узровень падрыхтоўкі суб'ектаў гандлю да рэалізацыі асноўных функцый у сферы таварна-грашовага абарачэння), палітычных (працэс інкарпарацыі зямель Беларусі ў састаў Расійскай дзяржавы, руска-французская вайна 1812 г., змена накірункаў знешняй і ўнутранай палітыкі Расіі), прававых (заканадаўчыя акты, якімі рэгулявалася гандлёвая дзейнасць), эканамічных (тарыфная палітыка, наяўнасць эфектыўнай гандлёвай інфраструктуры, умовы канкурэнцыі на ўнутраным і знешнім рынку, манетарная палітыка, цэнавая палітыка) фактараў, якія ўплывалі на тактыку і стратэгію арганізацыі дзейнасці асноўных суб'ектаў гандлёвага працэса.



2. Дамінантнай фігурай у гандлёвай сферы беларускага рэгіёну ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. становіцца гільдыйскае купецтва. Завяршаецца працэс арганізацыйнага афармлення купецкага саслоўя. Важкі эканамічны статус купецтва садзейнічаў станаўленню асабовых прывілеяў гільдыйскіх гандляроў, дзяржаўнаму распрыгоньванню купецтва. Якасныя змены ў асяроддзі купецкага саслоўя стымулявалі яго колькасны рост. Эканамічная актыўнасць купецтва і, перш за ўсе, гандляроў яўрэйскага паходжання стрымлівалася супярэчлівай, недастаткова акрэсленай гандлёва-эканамічнай палітыкай расійскага ўрада.

3. У канцы XVIII — першай трэці XIX ст. унутраны гандаль у беларускіх губернях ажыццяўляўся ў трох формах: перыядычнай (кірмашовай, базарнай), неперыядычнай (развозна-разноснай), рэгулярна-стацыянарнай (крамнай). Вядучую ролю ў сістэме мабілізацыі і рэалізацыі тавараў адыгрывалі кірмашы. Кірмашовы гандаль арганічна дапаўняўся базарным гандлем. Базары функцыянавалі ў большасці гарадоў і мястэчак тагачаснай Беларусі і з'яўляліся адным са сродкаў мабілізацыі капіталаў дробных гандляроў. Развіццё прамысловасці, рост гарадоў і гарадскога насельніцтва, павольнае паляпшэнне спажывання садзейнічалі станаўленню і паступоваму развіццю крамнага гандлю. Сістэма таваразбыта разглядаемага перыяду мела патрэбу ў вялікай колькасці пасрэднікаў: прасолаў, фактараў, маклераў, афеняў, карабейнікаў, хадзебшчыкаў і г.д. Усе сферы ўнутранага рынка, нягледзячы на іх адносную разназначнасць, з'яўляліся неабходнымі і знаходзіліся ў пэўных суадносінах, абумоўленых канкрэтнымі асаблівасцямі гістарычнага моманту.

4. Працэс гандлёва-эканамічнай пераарыентацыі зямель Беларусі ў апошняй трэці XVIII – першай трэці XIX ст. суправаджаўся паглыбленнем міжрэгіянальнага абмену беларускіх губерняў з эканамічнымі раёнамі Расійскай дзяржавы, фарміраваннем беларускага сектара ў структуры знешняга гандлю Расіі. У акрэслены перыяд даволі выразна праявілася спецыялізацыя губерняў Беларусі па складу экспартуемай прадукцыі і па накірунках гандлёва-эканамічных сувязей. Выключна важнае значэнне ў ажыццяўленні ўнутранага і знешняга тавараабмену ігралі рэкі Нёман, Заходняя Дзвіна, Буг, Шчара, Днепр, Прыпяць, Сож, на якіх размяшчаліся буйныя прыстані і за кошт якіх фарміравалася неабходная гандлёвая інфраструктура.

**Асабісты ўклад саіскальніка.** Увесь аб'ём даследавання па тэме дысертацыі выкананы самастойна. Аўтарам вывучаны, прааналізаваны і сістэматызаваны значны фактычны архіўны матэрыял, частка якога ўпершыню ўводзіцца ў навуковы абарот, навуковыя працы айчынных і замежных гісторыкаў. У выніку навуковага абагульнення саіскальнікам рэзюміруюцца асноўныя палажэнні і высновы дысертацыі.

**Апрабацыя вынікаў даследавання.** Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэнні кафедры гісторыі Беларусі Установы адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы" і была рэкамендавана да абароны. Важнейшыя назіранні і высновы, атрыманыя ў ходзе даследавання, былі апрабіраваны аўтарам пад час выступленняў на

наступных навуковых канферэнцыях і семінарах: навукова-практычнай канферэнцыі “Старонкі гісторыі Свіслацкага краю” (г.Свіслач, 1998 г.); навуковай гісторыка-краязнаўчая канферэнцыі “Старонкі гісторыі Зэльвеншчыны” (г.п. Зэльва, 1998 г.); навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі “Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця” (г. Мінск, 1999 г.); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Культура Гродзенскага рэгіёна: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа” (г.Гродна, 1999 г.); рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі “Работа з адоранай студэнцкай і вучнёўскай моладдзю: стан, формы і метады, перспектывы развіцця” (г. Гродна, 2000 г.); рэспубліканскай навуковай канферэнцыі “Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця” (г. Гродна, 2002 г.); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Навука і адукацыя ва ўмовах сацыяльна-эканамічнай трансфармацыі грамадства” (г. Гродна, 2002 г.); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Шлях да ўзаемнасці” (г. Гродна, 2002 г.).

**Апублікаванасць вынікаў.** Асноўныя вынікі даследавання выкладзены ў навуковых артыкулах, у тым ліку 2 – у навуковых часопісах, 8 – у зборніках матэрыялаў канферэнцый. Агульны аб’ём публікацый – 63 старонкі.

**Структура і аб’ём дысертацыі**. Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі працы, трох глаў (другая і трэцяя з якіх разбіты на два параграфы кожная), заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і літаратуры, дадаткаў. Поўны аб’ём дысертацыі складае 144 старонкі, з якіх спіс крыніц і літаратуры займае 15 старонак і прадстаўлены 266 назвамі, дадаткі – 23 старонкі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Першая глава** “Гістарыяграфія і крыніцы” змяшчае паслядоўны агляд расійскай, савецкай, замежнай і айчыннай гістарыяграфіі па даследуемай тэме, а таксама характарыстыку крыніцавай базы даследавання.

Першыя спробы фрагментарнага аналізу ці проста апісання таварна-грашовых адносінаў на тэрыторыі Беларусі ў акрэслены прамежак часу адносяцца да 30-х гг. XIX ст. У працах Г.Астраменцкага[1], Ю.Крашэўскага[2], Г.Нябольсіна[3] ўвага канцэнтравалася пераважна на пытаннях, звязаных з функцыянаваннем буйнейшых беларускіх кірмашоў (Зэльвенскага, Мінскага, Свіслацкага), асартыментам беларускага экспарту і імпарту, станам водных шляхоў зносінаў, развіццём мытных структураў беларускага рэгіёну.

У агульнарасійскім рэчышчы адбывалася даследаванне гандлёва-эканамічнага развіцця Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Інтэнсіўная палітыка расійскага ўрада ў галіне таможанага заканадаўства знайшла адлюстраванне ў працы буйнейшага знаўцы мытнага права К.Ладыжэнскага[4]. Значным укладам у гістарыяграфію праблемы развіцця гандлёва-прамысловага комплекса беларускіх губерняў Расійскай імперыі стаў выхад “Гістарычнага нарыса абкладання гандлю і промыслаў у Расіі” (1893 г.)[5]. Багаты юрыдычны матэрыял працы дапасоўваецца шэрагам каментарыяў і ацэнак расійскага заканадаўства ў дачыненні да гандлёвага саслоўя краіны. Спектр пытанняў, цікавіўшых расійскага эканаміста Н.Д.Чэчуліна, уключаў арганізацыю падаткаабкладання, а таксама развіццё фінансавай сістэмы Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст.[6] Пэўная ўвага ўдзялялася аўтарам сацыяльна-эканамічнаму становішчу яўрэяў тагачаснай Беларусі, пытанням адносінаў расійскага ўрада да яўрэйскага гандлю. Непасрэдна гандлёвая палітыка расійскага ўрада ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. дэталёва аналізавалася ў працы П.Б.Струвэ[7].

Асобны пласт у гістарыяграфіі даследуемай праблемы складаюць працы па гісторыі яўрэйскага народа ў Расіі. Пачатак глыбокаму вывучэнню шматвяковай гісторыі расійскіх яўрэяў быў пакладзены І.Г.Аршанскім. У сваёй працы “Яўрэі Расіі: Нарысы і даследаванні”[8] ён скрупулёзна разбірае законы адносна яўрэяў і іх практычную рэалізацыю, прыводзіць дадзеныя дэмаграфічнага кшталту, статыстыку, якая адлюстроўвае стан яўрэйскай прамысловасці і гандлю. М.Д.Градоўскі з’яўляецца аўтарам твораў у абарону правоў яўрэяў у Расіі. Сваё даследаванне “Заўвагі на запіску князёў Галіцыных…”[9] ён прысвяціў разгляду такога прававога феномену, як мяжа аседласці. У манаграфіі “Гандлёвыя і іншыя правы яўрэяў ў Расіі”[10] М.Д.Градоўскі ідэалізаваў “заканадаўчую волю” імператрыцы Кацярыны II адносна яўрэяў і ўскладваў віну за ўстанаўленне выключных мераў адносна яўрэяў і дэфармацыю “ў аснове ідэі роўнасці” на кіруючы сенат.

20-я гг. XX ст. адзначаны з’яўленнем даследаванняў гісторыкаў, грамадскіх дзеячаў, якія ішлі ў рэчышчы беларускага адраджэння. Прадстаўнікамі гэтага накірунку ў беларускай гістарыяграфіі выступаюць У.Ігнатоўскі і М.Доўнар-Запольскі. У сваёй “Гісторыі Беларусі”[11] М.Доўнар-Запольскі праводзіць тэзіс двух зол – польскага і маскоўскага, і дае адмоўную характарыстыку эканамічнаму становішчу, ў якім апынуліся беларускія землі пасля канчатковага далучэння да Расійскаі імперыі: гандаль насіў транзітны характар, быў пранізаны духам спекуляцыі, адзначаўся сціпласцю і мізэрнасцю; мясцовыя кірмашы былі нязначнымі; буйныя капіталы адсутнічалі. Выніковыя пытанні, вырашаныя ў ходзе даследчыцкай працы У.Ігнатоўскага[12] бачацца больш аргументаванымі. Аўтар адзначае маламагутнасць капіталаў айчынных купцоў, канстатуе высокую ўдзельную вагу яўрэйскіх гандляроў, вылучае ў якасці тыповага гандлёвага “прадпрыемства” невялікую краму ўніверсальнага тыпу.

---

[1]Остромецкий Г. Описание Зельвенской ярмарки //Журнал Министерства внутренних дел. – 1831. – ч.!V. – кн. 2. – С. 153-156; Ён жа. Описание Свислочской ярмарки /Журнал Министерства внутренних дел. – 1831. – ч.IV. – кн. 2. – С. 157-160; Ён жа. Сведения о Минских контрактах //Журнал Министерства внутренних дел. – 1831. – ч.IV. – кн. 1. – С. 137-145.
[2]Крашевский Ю.И. Пинск и его окрестности //Нёман. – 1995. - №8. – С. 224-233.
[3]Статистические записки о внешней торговле России. Ч.2 /Сост. Г. Небольсин. – СПб., 1835.
[4] Ладыженский К. История русского таможенного тарифа. – СПб.: Тип. В.С. Балашева, 1886.



[5] Исторический очерк обложения торговли и промыслов в России. – СПб, 1893.
[6]Чечулин Н.Д. Очерки по истории русских финансов в царствование Екатерины II. – СПб.: Сенатская типография, 1906.
[7]Торговая политика России. /Лекции доцента П.Б.Струве, читанные на экономическом отделении Санкт-Петербургского политехнического института. 2-е изд. – СПб.: Типо –Литография И. Трофимова, 1913.
[8]Оршанский И.Г. Евреи в России: Очерки и исследования. – СПб., 1872. – Вып.1. – 233 с.
[9]Градовский Н.Д. Замечания на записку князей Голицыных о черте оседлости евреев. – СПб., 1886. – 261 с.
[10]Градовский Н.Д. Торговые и другие права евреев в России в историческом ходе законодательных мер, предшествовавших ныне действующему законодательству о евреях. – СПб.: Тип. В. Киршбаума, 1885. – 287 с.
[11]Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. /Пер. з рус. Т.М. Бутэвіч, Т.М. Кароткая, Е.П. Фешчанка. – Мн.: БелЭн, 1994. – 510 с.
[12]Игнатовский В. Белоруссия. Территория, население, экономика, важнейшие моменты истории. – Мн.: Изд-во “Белтрестпечать”, 1924. – 56 с.

Распрацоўкай пытанняў уплыву таварна-грашовых адносінаў на гаспадарку прыгоннікаў і сялян Беларусі займаўся К.І.Кернажыцкі.[13] Знаходзячыся ў палоне тэорыі "гандлёвага капіталу", абгрунтаванай М.Н.Пакроўскім,[14] даследчык разглядаў працякаўшыя ў Беларусі сацыяльна-эканамічныя працэсы як вынік уздзеяння гандлёвага капіталізму. Тэрыторыя Беларусі, паводле К.І.Кернажыцкага, "калонія царскай Расіі, яе сыравінны прыдатак, рынак збыту прамысловых вырабаў". На падставе архіўных матэрыялаў і дадзеных І.Зяленскага даследчык паспрабаваў апісаць знешні гандаль тагачаснай Беларусі, прааналізаваўшы экспар і імпарт. Прапанаваны лічбавы матэрыял меў ілюстрацыйны характар, дынаміка развіцця і суадносіны розных формаў гандлю раскрыты аўтарам не былі.

У пасляваенны час у беларускай гістарычнай навуцы склаўся спецыфічны падыход да вывучэння палітычных і сацыяльна-эканамічных працэсаў канца XVIII – першай паловы XIX ст. Афіцыйная школа разглядала падзелы Рэчы Паспалітай як справядлівую акцыю ўз'яднання беларускага народа з рускім. Такі падыход адбіваўся на ацэнцы гандлёва-эканамічных працэсаў, якія працякалі ў беларускім рэгіёне.

Своеасаблівым рэліктам свабоднай эканамічнай думкі ў савецкай гістарычнай літаратуры бачыцца манаграфія М.М.Улашчыка "Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии"[15]. Аўтар адным з першых адзначае высокую ступень развіцця местачковага кірмашовага гандлю, паступовае скарачэнне перыядычнага гандлю ў 30-50-я гг. XIX ст., уплыў працэсу ўрбанізацыі на пашырэнне ўнутранага рынка, паглыбленне грамадскага падзелу працы.

У 60-80-я гг. гістарыяграфічная база для вывучэння айчыннага рынка папоўнілася шэрагам грунтоўных даследаванняў В.У.Чапко[16]. Даследчыца падвяргае аналізу колькасны састаў купецтва беларускіх гарадоў ў канцы XVIII – першай палове XIX ст., вызначае характар гандлёвай дзейнасці купцоў і яе рэгіянальныя асаблівасці, дае агульную характарыстыку асноўных формаў гандлю. Адзін з артыкулаў В.У.Чапко непасрэдна прысвечаны развіццю гандлёва-эканамічных сувязей зямель Беларусі з Украінай ў першай палове XIXст.[17]

Асобныя пытанні гандлёвага супрацоўніцтва беларускіх губерняў і Украіны ў межах агульнарасійскага рынка разглядаюцца І.А.Гуржым у манаграфіі "Развіток товарного вiробництва i торгiвлi на Українi (з кiнця XVIII ст. да 1861 года)"[18]. Агляд украінска-беларускіх гандлёвых сувязей ў другой палове XVIII ст. зроблены і ў артыкуле І.Г. Шульгі[19].

[13] Кернажыцкі К.І. Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі у канцы XVIII – першай палове XIX ст. (Да праблемы разлажэння феадалізму ў Беларусі). – Мн., 1935.
[14] Покровский М.Н. Русская история в самом сжатом очерке. С древнейших времён до конца XIX ст. – М. – Ленинград, 1931. – 273с.
[15] Улащик Н.Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. – Мн.: Изд-во "Наука", 1965. – 479 с.
[16] Чепко В.В. Города Белоруссии в первой половине XIX в. (экономическое развитие). – Мн.: Изд-во БГУ им. В.И. Ленина, 1981. – 143 с.;
[17] Чепко В.В. Экономические связи Белоруссии и Украины в первой половине XIX в. //Вопросы истории: Межвузовский сборник. – Мн.: Изд-во БГУ им. В.И. Ленина, 1975. – Вып. 2. – С.101-107.
[18] Гуржий И.А. Развиток товарного виробництва і торгівлі на Україні (з кінця XVIII ст. до 1861 року). – Киев: Вид-во Акад. наук Украинской ССР, 1962. – 207с.
[19] Шульга И.Г. Из истории украинско-белорусских экономических связей во второй половине XVIII века //Советское славяноведение. Материалы IV конференции историков-славистов. – Мн.: Изд-во БГУ им. В.И. Ленина, 1969. – С. 491-495.



Праблема генезіса і развіцця капіталістычных адносінаў у гандлёвай сферы Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. стала аб'ектам увагі ў працах А.М.Лютага[20]. На падставе багатага кола крыніцаў аўтар праводзіць глыбокі аналіз гандлю беларускіх гарадоў: даследуе колькасны склад купецкага саслоўя, вызначае асноўныя формы гандлю ў пераходны ад феадалізму да капіталізму перыяд.

Публікацыі апошняга дзесяцігоддзя вызначаюцца зваротам даследчыкаў непасрэдна да пытанняў арганізацыі гандлёвай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ў перыяд фарміравання капіталістычных адносінаў. У вядомай ступені этапнай патрэбна разглядаць працу В.І.Мерзляка, прысвечаную складанейшаму пытанню гісторыі Беларусі канца XVIII – першай трэці XIX ст. – фарміраванню ўнутранага рынка ў рэгіёне[21]. В.В.Шведам грунтоўна даследуецца стан кірмашовага, развозна-разноснага, базарнага і стацыянарнага гандлю, склад купецтва і крыніцы накаплення капіталаў у 30-50-я гг. XIX ст.[22]

Цікавымі і карыснымі для вывучэння ўзнятай праблемы з'яўляюцца працы польскіх гісторыкаў. Гандлёвыя ўзаемаадносіны Расіі з Царствам Польскім ў акрэслены перыяд знайшлі сваё адлюстраванне на старонках як спецыяльных манаграфій (Ч.Стшэшэўскі[23], А.Язерскі[24]), так і ў сінтэзных працах па эканамічнай гісторыі Польшчы (Я. Руткоўскі).[25]

Істотны інтарэс для вывучэння рыначных адносінаў на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. уяўляюць працы сучасных расійскіх гісторыкаў Н.В.Казловай, Б.М.Міронава, Т.М.Цімошынай і інш.[26] Праблематыка гэтых даследаванняў выходзіць далёка за межы аналіза эканамічных рэалій развіцця расійскага рынка ў акрэслены адрэзак часу. Увагу даследчыкаў прыцягваюць сацыяльныя аспекты светаўспрымання і самасвядомасці купецтва, пытанні фарміравання менталітэта і культуры прадпрымальнікаў.

Багаты фактычны матэрыял змяшчаюць апублікаваныя і неапублікаваныя дакументы і матэрыялы. Сярод афіцыйных выданняў, перш за ўсё, патрэбна адзначыць "Полное собрание законов Российской империи"[27], "Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев..."[28],"Общий тариф для всех портов и

[20] Лютый А.М. Основные формы торговли в Белоруссии в период разложения феодализма //Вопросы истории. Межведомственный сборник. – Мн.: Изд-во "Университетское", 1984. – Вып.11. – С. 126 – 134.; Ён жа. Социально – экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. – Мн.: Наука и техника, 1987. – 181 с.
[21] Мерзляк В.И. Внутренняя торговля Белоруссии конца XVIII – первой трети XIX в. Методическое пособие к спецкурсу по истории БССР. – Мн.: Минск. гос. пед. ин-т., 1991. – 60 с.
[22] Швед В.В. Торговля в Белоруссии в период кризиса феодализма. (1830 – 1850 годах). - Гродно: ПКФ "Орбикс", 1995. —135 с.
[23] Strzeszewski Cz. Handel Zagraniczny Krolestwa Kongresowego (1815 – 1830). – Lublin, 1937.
[24] Jezierski A. Handel zagraniczny Krolestwa Polskiego. 1815 – 1914. – Warszawa, 1967.
[25] Рутковский Я. Экономическая история Польши. /Под ред. Ф.Я. Полянского. – М., 1953. – 426 с.
[26] Козлова Н.В. Русский абсолютизм и купечество в XVIII в. – М.: Археографический центр, 1999. – 384с.; Миронов Б.Н. Социальная история России периода империи (XVIII – XIX в.): Генезис личности, демократизация семьи, гражданского общества и правового государства: В 2-х т. Т.1. – СПб.: Дмитрий Буланин, 1999. – 547с.; Т.2. – СПб.: Дмитрий Буланин, 1999. – 566с.; Тимошина Т.М. Экономическая история России/ Под ред. проф. М.Н. Чепурина. – М.: Информационно издательский Дом "Филинъ", Юридический Дом "Юстицинформ", 1998. – 432с.; Предпринимательство и предприниматели России от истоков до начала XX в. – М.: РОССПЭН, 1997. – 344с.
[27] Полное собрание законов Российской империи. Собр-е 1-ое. – ТТ. 19-43. – СПб., 1830; Собр-е 2-ое. – ТТ. 1-8. – СПб., 1830-1834.
[28] Левэнда В.О. Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев от Уложения царя Алексея Михайловича до настоящего времени (1649 – 1873): Извлечения из Полного Собрания Законов Российской империи. – СПб, 1874. – 1158 с.

таможен Российской империи кроме Астрахани, Оренбурга и Сибири...” (1782г.)[29], і “Дополнительное постановление об устройстве гильдий и торговле прочих состояний” (1824г.)[30]

Вялікую каштоўнасць для вывучэння гандлёвых адносінаў на землях Беларусі на золку капіталістычнага грамадства маюць дакументы і матэрыялы, апублікаваныя ў зборніках, выдадзеных Акадэміяй Навук БССР[31].

Фakталагічную базу даследавання склалі матэрыялы трох буйнейшых архіўных сховішчаў: Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гродне і Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Санкт-Пецярбургу. Асобнае месца сярод крыніц згаданых архіваў займаюць матэрыялы фондаў канцылярый мінскага (ф.295), віцебскага (ф.1430), магілёўскага (ф.2001) і гродзенскага (ф.1) грамадзянскіх губернатараў. У фондах захаваліся дадзеныя аб колькасці купецтва ў гарадах і паветах беларускіх губерняў, справаздачы аб стане кірмашовага і крамнага гандлю, звесткі аб суднаходстве па беларускіх рэках, матэрыялы аб адкрыцці кірмашоў і арганізацыі гандлёвага аблажэння, рапарты паліцэйскіх і таможаных устаноў аб кантрабандным гандлі і г.д. Сярод найбольш інфармацыйных патрэбна таксама пазначыць фонды Мінскага (ф.299) і Гродзенскага (ф.2) губернскіх праўленняў, канцылярыі Віцебскага, Магілёўскага і Смаленскага генерал-губернатара (ф.1297), а таксама Мінскай казённай палаты (ф.333).

Асобны пласт крыніцавай базы – мемуарная літаратура. Напоўніць каларытам гандлёвую рэчаіснасць Беларусі даследуемага перыяду дазваляюць творы В.Севяргіна, Л.Патоцкага, Ул.Сыракомлі, П.Шпілеўскага[32].

**У другой главе** “Фарміраванне новай гандлёвай прасторы, купецтва і яго капіталаў на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст.”, якая складаецца з двух параграфаў, разглядаецца працэс станаўлення і развіцця важнейшых элементаў гандлёвай сістэмы.

**Першы параграф** “Фарміраванне новай гандлёвай прасторы” прысвечаны аналізу асноўных фактараў, якія аказвалі ўплыў на эканамічную актыўнасць суб’ектаў гандлёвага працэса.

Важнейшым эканамічным вынікам ўключэння зямель Беларусі ў структуру агульнарасійскай гаспадарчай сістэмы з’явілася фарміраванне новай гандлёвай прасторы на тэрыторыі тагачаснай Беларусі. Для гандляра-пасрэдніка гандлёвай прастора - гэта сукупнасць сацыяльных, палітычных, эканамічных, праваых фактараў, ўплываўшых на тактыку і стратэгію арганізацыі гандлёвай дзейнасці.

[29] Общий тариф для всех портов и пограничных таможен Российской империи кроме Астрахани, Оренбурга и Сибири, сочинённой в Комиссии о коммерции. – Спб., 1782.
[30] Дополнительное постановление об устройстве гильдий и торговле прочих состояний. – СПб., 1824.
[31] Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі ў часы распада феадалізма. У 2 ч. – Ч.1. – Мн.: Выд-ва Беларускай АН, 1934 – 300 с.; Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т.2. (1772 – 1903 гг.). /Пад рэд. Н.М. Нікольскага. – Мн.: Выд-ва Акадэміі Навук БССР, 1940. – 988 с.; Белоруссия в эпоху феодализма: Сборник документов и материалов в 4-х т. /АН БССР; Ин-т истории. – Мн.: Изд-во АН БССР, 1959 – 1979. - Т.3 - 1961. – 625 с.
[32] Севергин В. Записки путешествия по западным провинциям Российского государства или минералогические, хозяйственные и другие примечания, учиненные во время проезда чрез оные в 1802 году. – СПб., При Имп. Акад. Наук, 1803. – 168с; Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану /Укл. прадмова, камент. А.М. Філатавай. – Пер. з польск. І.У. Саламевіча, Мн.: Полымя, 1997. — 270 с; Шпилевский П.М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. – Мн.: Полымя, 1992. – 251 с; Сыракомля У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: Успаміны, даследаванні гісторыі і звычаяў. /Пер. з польскай мовы, прадм., камент. К. Цвіркі. – Мн.: Полымя, 1992. – 159 с.



Найбольш грунтоўнымі фактарамі сацыяльнай сферы, якія прама ці ўскосна ўплывалі на функцыянаванне корпуса гандляроў, з’яўляюцца наступныя: адносіны дзяржаўнага апарата, у прыватнасці расійскага ўрада, да заняткаў гандлёва-пасрэдніцкай дзейнасцю; сацыяльны склад удзельнікаў гандлёвага працэсу; узровень падрыхтоўкі суб’ектаў гандлю да рэалізацыі асноўных функцый у сферы таварна-грашовага абарачэння.

У разрэзе эканамічнай палітыкі Расійскай імперыі канца XVIII — першай трэці XIX ст. гандаль бачыўся адным з прыярытэтных накірункаў народнай гаспадаркі. Таварна-грашовая палітыка царскага ўрада адлюстроўвала тыя глыбінныя зрухі, якія адбываліся ў сацыяльна-эканамічнай сферы Расіі і Беларусі (як часткі імперыі) у канцы XVIII — першай трэці XIX ст. Накірунак гэтых зменаў вызначаўся працэсам распаду феадальна-прыгонніцкай сістэмы і ўсё большым пранікненнем ў жыццёвы уклад капіталістычных адносінаў. Аднак адлюстраванне гэтых працэсаў было частковым і непаслядоўным. Знешне ліберальнае і заахвочвальнае стаўленне расійскага ўрада да ўнутранага і знешняга гандлю, у шматлікіх аспектах было адзначана ваганнямі і супярэчнасцямі.

У аснову гандлёвага заканадаўства быў пакладзены саслоўны прынцып. Ставілася мэта захаваць парадак, пры якім кожнае саслоўе выконвае сваё прызначэнне і функцыю. Дакладнае вызначэнне эканамічнага статуса асноўных саслоўяў дзяржавы найбольш выразна выявілася ў “Дадатковым пастанаўленні аб усталяванні гільдый і гандлі іншых станаў” (1824 г.). У гэтай пастанове ўрад строга рэгламентаваў гандлёвыя правы асобных саслоўяў, засцерагаў прывілеі гільдыйскага купецтва і абмяжоўваў дзейнасць гандляроў, паходзіўшых з сялян і мяшчан. Між тым, кіруючыя колы былі вымушаны лічыцца з новымі з’явамі ў сацыяльна-эканамічным жыцці краіны і ісці на пэўныя ўступкі эканамічна ангажаванай часткі насельніцтва, пашыраючы гандлёвую кампетэнтнасць дваран, мяшчан, сялян і інш.

Адчувальнае ўздзеянне на фарміраванне гандлёвай прасторы на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. аказвалі фактары палітычнага характару: руска-французская вайна 1812 г., змена накірункаў знешняй і ўнутранай палітыкі Расійскай дзяржавы.

Заканадаўча-прававы змест гандлёвай прасторы Беларусі фарміраваўся за кошт пастановаў і ўказаў расійскага ўрада, накіраваных на фарміраванне адзінага прававога поля для заняткаў гандлёвай дзейнасцю і паглыбленне гандлёвых сувязей беларускіх губерняў з эканамічнымі раёнамі Расіі.

Сярод фактараў, якія генерыруюцца эканамічнай сферай, найбольш важнымі бачацца: тарыфная палітыка, наяўнасць эфектыўнай гандлёвай інфраструктуры, умовы канкурэнцыі на ўнутраным і знешнім рынках, манетарная палітыка, цэнавая палітыка.

Эвалюцыя тарыфнага заканадаўства даследуемага перыяду ўяўляла сабой пошук найбольш аптымальнага варыянта пабудовы структуры экспартна-імпартных аперацый. Пры гэтым урадавыя колы імкнуліся дбаць, у першую чаргу, інтарэсы памешчыцка-дваранскага саслоўя, робячы экстравагантныя захады ў накірунку лібералізацыі таварна-грашовых адносінаў, арыентуючы

знешні гандаль на вываз прадуктаў сельскагаспадарчай вытворчасці. Аднак такая лінія паводзінаў урада неаднойчы перарывалася аб'ектыўнай неабходнасцю ўвядзення сістэмы ахоўных тарыфаў, што дыктавалася працэсам станаўлення айчыннага гандлёва-прамысловага элемента.

Уключэнне тэрыторыі Беларусі ў арбіту агульнарасійскага рынка суправаджалася ўзмацненнем канкурэнцыі з боку купецкага саслоўя Расіі. Канкурэнцыя з боку расійскіх купцоў дапасоўвалася эканамічным націскам украінскіх, польскіх, нямецкіх, прыбалтыйскіх, сярэднеазіяцкіх гандляроў, якія затаварвалі беларускі рынак таннымі і, як правіла, больш якаснымі таварамі, стрымліваючы гэтым самым працэс накаплення капітала мясцовымі купцамі.

Фактарам, замаруджваўшым рост "капіталістасці" беларускіх гандляроў, бачыцца прадваранскі накірунак гандлёва-эканамічнай палітыкі ўрада. Патрэбы купецтва ў развіцці вэксальнай абарачальнасці і заснаванні камерцыйных банкаў ігнараваліся. Адзінай дзяржаўнай установай, якая рэальна магла паправіць фінансавыя справы беларускіх гандляроў за невялікія працэнты былі Прыказы грамадскай апекі.

Унутраны рынак Беларусі захоўваў на працягу акрэсленага прамежку часу шэраг спецыфічных рысаў. Нягледзячы на панаванне ў першай трэці XIX ст. рускіх манет (залаты імперыял, залаты чырвонец, срэбныя і медныя грошы, асігнацыі), працягвалася абарачэнне польска-літоўскіх і заходнееўрапейскіх манет. Адсутнасць адзінай манетарнай палітыкі аказвала адмоўны рэзананс на сферу таварна-грашовага абарачэння, зніжаючы паказчыкі ліквіднасці капіталаў.

Канец XVIII — першая трэць XIX ст. — перыяд параўнальна хуткага развіцця воднага і сухапутнага транспарту. Склалася асноўная канфігурацыя грунтовых дарог, атрыманых у спадчыну ад Рэчы Паспалітай, але значна трансфармаваных у адпаведнасці з новымі эканамічнымі ўмовамі. Разам з тым, на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII — першай трэці XIX ст. не была створана адзіная транспартная сетка, эксплуатацыя шляхоў зносін насіла сезонны характар, водны транспарт знаходзіўся на прымітыўным узроўні.

**У другім параграфе** "Купецтва Беларусі і яго капіталы" разглядаецца працэс фарміравання купецкага саслоўя Беларусі, вызначаецца колькасны і якасны састаў гандлёвага корпуса, яго сацыяльна-прававы статус, акрэсліваюцца крыніцы і інструменты накаплення капіталаў.

Паводле Маніфеста 1775г. купецтва падзялялася на тры гільдыі, вызвалялася ад падушнага падатку і абкладалася аднапрацэнтным зборам з абвешчанага капітала. У аснову падзелу на гільдыі быў пакладзены маёмасны цэнз. Атрымаць статус гільдыйскага купца маглі асобы, валодаўшыя капіталам не меней 500 руб.

На працягу даследуемага перыяду сума абвяшчаемых капіталаў значна ўзрасла: для купца 1-й гільдыі - да 50 000, для купца 2-й гільдыі – да 20 000, для купца 3-й гільдыі– да 8 000 руб. Паралельна з ёй тэндэнцыю росту выяўляў і гільдыйскі збор. У 1812 г. ён дасягнуў максімальнай велічыні 4¾ %.

Гарадавое Палажэнне ад 21 красавіка 1785г. зацвярджала карпарацыйную арганізацыю ў сферы гандлю. Дзяржава аб'яўляла права на вытворчасць гандлю фінансавай крыніцай і "прадавала" гандлёвыя правы за пэўны грашовы ўзнос, аднак



пры гэтым эканамічная кампетэнтнасць розных катэгорый гандляроў абумоўліваліся памерамі абвяшчаемых капіталаў і выплочваемага з іх працэнтнага падатку.

З увядзеннем "Дадатковага пастанаўлення аб усталяванні гільдый..." 1824г. пачынаецца другі перыяд ў развіцці заканадаўства аб гандлёва-прамысловым абкладанні, якое прыняло на гэты раз форму патэнтнай сістэмы. Гільдыйскі падатак замест працэнтнага збора з абвяшчаемых капіталаў ператвараўся ў нязменны аклад, спаганяемы за пасведчанне на права гандлю.

Канец XVIII – першая трэць XIX ст. – перыяд станаўлення асабовых прывілеяў купецтва, яго дзяржаўнага распрыгоньвання. Прыналежнасць да гільдыі і ўплата працэнтнага збору з капітала вызвалялі прадстаўнікоў купецкага саслоўя ад асабістай рэкруцкай павіннасці, пазбаўлялі неабходнасці выконваць казённыя "службы" ці "нарады" па розных дзяржаўных зборах. "Першастацейныя" купцы (купцы 1-й гільдыі) валодалі правам насіць шаблю і губернскі мундзір, удастойвацца званняў камерц – і мануфактур-саветнікаў. У 1802 г. на купецтва быў распаўсюджаны 2 артыкул "Даравальнай граматы дваранству", паводле якога спадчынны маёнтак, "у выпадку асуджэння і па важнейшаму злачынству, будзе аддадзены законнаму яго нашчадку ці нашчадкам". Купецтва першых дзвюх гільдый вызвалялася ад цялесных пакаранняў і магло ездзіць у карэце "параю ці чацвярнёю коней"; купцы трэцяй гільдыі падвяргаліся цялеснаму пакаранню толькі па прысуду крымінальнага суда і г.д.

Якасныя змены ў асяроддзі купецтва стымулявалі яго колькасны рост. Пярыяд з канца XVIII ст. да 30-х гг. XIX ст. адзначаны павелічэннем колькасці гільдыйскага купецтва з 230 чалавек у 1798 г. да 3 337 у 1833 г. Такая трансфармацыя адбывалася на фоне скарачэння агульнай колькасці гандлюючых.

Асобным юрыдычным статусам ў сістэме таварна-грашавых адносінаў валодалі яўрэйскія гандляры. Супярэчлівасць гандлёвай палітыкі расійскага ўрада ў адносінах да яўрэйскіх купцоў праявілася ў вызначэнні рысы яўрэйскай аседласці, увядзенні падвойнага падатка з капіталаў і кантроля за яўрэйскім кніжным рынкам, дыферэнцыяцыі правоў яўрэйскіх і расійскіх купцоў на мытнях, высяленні яўрэяў за 50-вёрстную адлегласць ад мяжы і інш.

Сацыяльна-эканамічны зрэз гісторыі канца XVIII – першай трэці XIX ст. высвятляе адну з важнейшых праблемаў, звязаных з фарміраваннем адносінаў капіталістычнага тыпу – праблему першапачатковага накаплення капіталаў. Галоўнымі інструментамі фарміравання купецкіх капіталаў выступалі неэквівалентны абмен, пастаўкі ў казну, падрадавая дзейнасць, водкуп падаткаў, арэнда, набыццё зямельных участкаў, ўдзел ў суднаходных кампаніях і гандлёвых агенцтвах, знешні гандаль і інш.

**У трэцяй главе** "Формы і накірункі гандлю губерняў Беларусі", якая складаецца з двух параграфаў, засяроджваецца ўвага на асноўных арганізацыйных формах таварнага абарачэння, аналізуецца міжрэгіянальны і знешні гандаль губерняў Беларусі.

**Першы параграф** "Развіццё ўнутранага рынка Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст." акцэнтуе ўвагу на матэрыяльнай і прадметнай аснове айчыннага рынка – гандлёвай сетцы краіны.

Мабілізацыя і рэалізацыя тавараў на ўнутраным рынку Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. ажыццяўлялася ў некалькіх формах: кірмашовай, базарнай, развозна-разноснай і крамнай. Асноўнай арганізацыйнай формай таварнага абарачэння ў перыяд зараджэння капіталістычных адносінаў былі кірмашы. Урад ішоў насустрач пажаданням памешчыкаў і мясцовай адміністрацыі аб адкрыцці новых кірмашоў і базараў у гарадах і сёлах, справядліва лічачы іх галоўнымі каналамі збыту сельскагаспадарчай прадукцыі. Адваротны працэс - закрыццё кірмашоў - з'ява даволі рэдкая

Час правядзення большасці кірмашоў прыходзіўся на канец вясны – сярэдзіну восені. На такое нераўнамернае размеркаванне кірмашоў па месяцах уплываў шэраг фактараў: метэаралагічныя ўмовы, наяўнасць таварных лішкаў і патрэбнасць у грошах і таварах у пастаўшчыкоў сельскагаспадарчай прадукцыі – памешчыкаў і сялян, нераўнамернасць размеркавання рэлігійных святаў, у дні якіх адбываліся ўсе беларускія кірмашы.

У канцы XVIII – першай трэці XIX ст., паклаўшы ў аснову таварную спецыялізацыю, усе беларускія кірмашы можна падзяліць на сельскагаспадарчыя і ўніверсальныя. Архіўныя крыніцы, якія адносяцца да 30-х гадоў XIX ст., вылучаюць і такую катэгорыю як мануфактурныя кірмашы.

Большасць кірмашоў Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. мелі абароты не больш 2 000 – 5 000 руб. Сфера іх гандлёвага ўплыву была невялікая. Яна ахоплівала вёскі і сёлы ў радыусе на 15 – 20 вёрстаў. Працягваліся такія кірмашы адзін дзень і па свайму характару набліжаліся да штотыднёвых базараў і таргоў.

Па абароту грашовых сумаў, па колькасці прывезеных і прададзеных тавараў вылучаліся Петрапаўлаўскі кірмаш у м.Бешанковічы Віцебскай губерні, Ганненскі ў м.Зэльва, Успенскі і Пакроўскі ў м.Прэборава Гродзенскай губерні, кантрактавы ў Мінску, Троіцкі ў м.Гомель Магілеўскай губерні. Гандлёвыя абароты гэтых кірмашоў складалі больш 100 000 руб. Яны адыгрывалі значную ролю ў гандлі мясцовымі, рускімі, украінскімі і замежнымі таварамі.

Узяўшы за аснову велічыню абслугоўваемага сектара расійскага рынка, беларускія кірмашы можна падзяліць на дзве катэгорыі: кірмашы, якія абслугоўвалі пэўны мясцовы рынак і кірмашы, якія абслугоўвалі ўсерасійскі рынак. Большасць кірмашоў Беларусі адносілася да першай катэгорыі. Тавары з усёй імперыі і са знешніх рынкаў траплялі на абмежаваны кантынгент кірмашоў: Нясвіжскі, Кобрынскі, Навагрудскі, Аршанскі, Мінскі кантрактавы, Свіслацкі, Зэльвенскі кірмашы.

З развіццём прамысловасці, урбанізацыяй гарадоў, паступовым пашырэннем унутранага рынка побач з кірмашовым гандлем набіраў сілу рэгулярны крамны гандаль. Значэнне гэтай формы гандлёвых адносінаў паступова ўзрастала. За сем гадоў (з 1825 па 1833) колькасць крамаў у гарадах Беларусі павялічылася прыблізна ў 2,1 разы (з 1 340 да 2 817). Па тэмпах росту крамнага гандлю ў гарадах Беларусі на першае месца выйшлі Мінская і Віленская губерні, а па колькасці крамаў – Мінская, Магілёўская і Гродзенская губерні.

Немалаважную ролю ў структуры ўнутранага размеркавання прадуктаў адыгрываў базарны гандаль. Функцыі базараў не абмяжоўваліся толькі забеспячэннем гараджан прадуктамі харчавання. На іх адбывалася закупка сельскагаспадарчых прадуктаў для адпраўкі ў іншыя губерні і нават за мяжу. Сяляне пасля рэалізацыі сваёй прадукцыі атрымлівалі тут грашовыя сумы, неабходныя для выплаты падаткаў, павіннасцей, даўгоў і для набыцця сельскагаспадарчых прыладаў і іншых мануфактурных тавараў. У залежнасці ад абароту, колькасці ўдзельнікаў, працягласці і рэгулярнасці базары падзяляліся на некалькі відаў, кожны з якіх меў сваю назву: таржок, базар, галоўны альбо вялікі базар, таргі, чырвоныя таргі.



Унутраны рынак даследуемага перыяду меў патрэбу ў мностве дробных гандлёвых пасрэднікаў. Важную ролю сярод скупшчыкаў адыгрывалі прасолы. Да ліку прасолаў адносіліся самавозы – гандляры, якія развозілі скупленыя тавары на конях ці на водным транспарце. Сярод самавозаў назіралася пэўная спецыялізацыя. Развозам і разносам прамысловых вырабаў займаліся афені, маскацельшчыкі, хадзебшчыкі, карабейнікі. Важную ролю ў беларускім рознічным гандлі ігралі фактары. Высокім даверам у сваіх патронаў-купцоў карысталіся пастаянныя ці часовыя камісіянеры, прыказчыкі. Інстытут маклерства, які ўсталяваўся на тэрыторыі Расійскай імперыі ў 1717 г., іграў таксама абслугоўваючую ролю.

**У другім параграфе** "Міжрэгіянальны і знешні гандаль" аналізуюцца асартыментны састаў і накірункі экспартна-імпартных таварных патокаў беларускіх губерняў.

Працэс гандлёва-эканамічнай пераарыентацыі зямель Беларусі ў апошняй трэці XVIII – першай трэці XIX ст. суправаджаўся паглыбленнем міжрэгіянальнага абмену беларускіх губерняў з эканамічнымі раёнамі Расійскай дзяржавы, фарміраваннем беларускага сектара ў сістэме знешняга гандлю Расіі.

У акрэслены прамежак часу даволі выразна праявілася спецыялізацыя губерняў Беларусі па складу экспартуемай прадукцыі і па накірунках гандлёвых сувязей з іншымі раёнамі Расіі.

Гандлёвыя стасункі Магілёўскай губерні цягацелі да Паўднёва-заходняга, Маларасійскага і Новарасійскага рэгіёнаў. Даходнымі артыкуламі гандлю ўсходняй часткі Беларусі былі лес і лясныя тавары, прамысловыя тавары, пянька, мёд, воск. У шэрагу тавараў, імпартуемых купцамі Магілёўскай губерні, адзначаны соль, зернавы хлеб, гарэлка, рыба, тытунь, сукно, жывёла, коні, мыла, свечкі.

Віцебская губерня найбольш цесна была звязана з Паўночна-заходнім эканамічным раёнам Расіі. У гандлі Віцебскай губерні лес, у параўнанні з Магілёўскай губерняй, меў меншае значэнне, аднак і тут ён з`яўляўся прыкметным прадметам вывазу за мяжу па Дзвіне і Нёману. У першай трэці XIX ст. віцебскія гандляры-прадпрымальнікі вызначыліся як пастаўшчыкі на знешні рынак ільну і вырабаў з яго. Акрамя названай прадукцыі праз рыжскі порт ажыццяўляўся збыт скур, сала, шэрсці, сукна, глінянага і драўлянага посуду, пянькі, смалы, нязначнай колькасці хлеба ў зерні і муцэ. Асартымент імпартуемай прадукцыі ўключаў хлеб, соль, "дамскія тавары", рыбу, чай, селядцы, цукар, тытунь, віно і інш.

Шырокім быў спектр гандлёвых стасункаў Гродзенскай губерні. У канцы XVIII - першай трэці XIX ст. заходняя частка тагачаснай Беларусі (у тым ліку і Гродзенская губерня) сваімі знешнегандлёвымі сувязямі цягацела да Польшчы і Заходняй Еўропы.

Купцы-аптавікі скуплялі ў сваёй і суседніх губернях хлеб, сала, масла, лён, ільняное насенне і адпраўлялі іх вялікімі партыямі з адкрыццём навігацыі за мяжу. На адваротным шляху яны везлі ў Гродна соль, селядцы, віно, часам мэблю, прадметы раскошы. Сукно гродзенскіх фабрык, акрамя продажу ў мясцовых крамах і на кірмашах унутры губерні, вывозілася ў Мінскую і Віленскую губерні, Дынабург, Мітаву, Крэмянчуг, Кіеў, Адэсу. Медны посуд і іншыя металічныя вырабы знаходзілі збыт у Царстве Польскім. Туды часткова прадавалі і выробленыя скуры.

Накірунак гандлёвых зносінаў Мінскай губерні быў найбольш разнастайным. Асноўнымі прадметамі вывазу, мяркуючы па архіўных дадзеных, з`яўляліся лес і лесатавары. Да пачатку XIX ст. лес з Мінскай губерні сплаўляўся пераважна ў Балтыйскія парты. Пазней лясны тавар пачаў накіроўвацца ў Маларасійскі і Новарасійскі раён – Крэмянчуг, Херсон, Екацярынаслаўль, Адэсу, на патрэбы Чарнаморскага флота. Вырабы прамысловых прадпрыемстваў Мінскай губерні, у прыватнасці сукно, паміма мясцовага збыту вывозіліся ў Вільна, Кіеў, Бердзічаў, Адэсу, Маскву, Пецярбург, свечкі – ў Варшаву, цукар – у Маскву і іншыя гарады, шкіпідар – у Рыгу і далей за мяжу, а таксама ў Крэмянчуг, Херсон, Адэсу.

Выключна важнае значэнне ў ажыццяўленні міжрэгіянальнага і знешняга тавараабмену ігралі рэкі Нёман, Заходняя Дзвіна, Буг, Шчара, Днепр, Прыпяць, Сож, на якіх размяшчаліся буйныя прыстані: гродзенская, брэсцкая, слонімская ў Гродзенскай губерні; пінская, стаўбцоўская, барысаўская, бабруйская, лоеўская ў Мінскай губерні; віцебская, полацкая, лепельская, ульская, чашніцкая ў Віцебскай губерні; магілёўская, рагачоўская, шклоўская, крычаўская ў Магілёўскай губерні.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць наступныя высновы :

1. Змяненне вектара гандлёва-эканамічных сувязей беларускіх зямель у канцы XVIII – першай трэці XIXст. суправаджалася фарміраваннем новай гандлёвай прасторы на тэрыторыі тагачаснай Беларусі. Эканамічная палітыка расійскіх улад была накіравана на нівеліраванне гаспадарчых асаблівасцей беларускіх тэрыторый, стварэнне адзінага прававога поля для заняткаў гандлёва-прамысловай дзейнасцю. У адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі абіраліся інструменты і сродкі іх рэалізацыі: уніфікацыя падатковай сістэмы, увядзенне адзінай сістэмы мер і вагі, распаўсюджванне расійскай манеты, укараненне рускага гандляра і г.д.

Знешне ліберальнае і заахвочвальнае стаўленне ўрада да ўнутранага і знешняга гандлю ў шматлікіх аспектах было адзначана ваганнямі і супярэчнасцямі. У сілу патрабаванняў ўнутранай палітыкі і з дыпламатычных меркаванняў урадавыя колы пераходзілі то ад забарончай палітыкі да ярка выяўленага свабоднага гандлю, то зноў вярталіся да ідэй меркантылізму, аднаўляючы апеку над айчынным гандлем. Саслоўны прынцып, пакладзены ў аснову гандлёвага заканадаўства, зведаў на працягу акрэсленага перыяду пэўныя змяненні, абумоўленыя новымі з'явамі ў сацыяльна-эканамічным жыцці краіны. Ва ўмовах развіцця таварна-грашовых адносінаў кіруючыя колы зрабілі шэраг адступленняў, дазволіўшы актыўна ўключыцца ў



гандлёвы працэс мяшчанам, дваранам, сялянам і іншым катэгорыям насельніцтва. Вядучае месца на ўнутраным і знешнім рынку паступова пачынае займаць купецтва.

Стан рыначнай інфраструктуры Беларусі ў канцы XVIII — першай трэці XIX ст. заставаўся недасканалым і патрабаваў далейшай мадэрнізацыі. У першую чаргу гэта тычылася фінансавай сферы (крэдытаванне купецтва), манетарнай палітыкі (уніфікацыя грашовых адзінак), тарыфнага заканадаўства (выпрацоўка аптымальнага варыянта тарыфа), палітыкі ў галіне падаткаў (зніжэнне гандлёвых збораў). Фактарам, замаруджваўшым рост капіталаў беларускага купецтва, можа разглядацца канкурэнцыя з боку гандлёвага саслоўя Расіі, а таксама эканамічны націск польскіх, украінскіх, нямецкіх, прыбалтыйскіх гандляроў. Кансервацыі ўстарэлых формаў арганізацыі гандлёвага-эканамічнай дзейнасці спрыяла прадваранская палітыка расійскага ўрада. І, тым не менш, аналіз стану гандлёвай прасторы Беларусі ў акрэслены перыяд сведчыць аб тым, што яе развіццё, ў асноўных тэндэнцыях, адпавядала працэсу фарміравання адносінаў капіталістычнага тыпу [4, 10].

2. Арганізатарам і кіраўніком гандлёвай дзейнасці на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. выступала купецтва. Станаўленню гандлёва-прадпрымальніцкай функцыі гільдыйскіх гандляроў садзейнічалі працэсы, якія адбываліся ў арганізацыйна-прававой сферы Расійскай дзяржавы ў даследуемы перыяд. На сярэдзіну 1780-х гг. прыпадае канчатковае афармленне падзелу купецтва на тры гільдыі. У аснову гэткага размежавання быў пакладзены маёмасны цэнз, які паступова ўзрастаў у першай чвэрці XIX ст. Паралельна з ім павялічваўся гільдыйскі збор. Захады з боку ўрада аптымізаваць гандлёвыя працэсы выліліся ў прыняцце патэнтнай сістэмы (1824г.): гільдыйскі падатак замест працэнтнага збору з абвяшчаемых капіталаў ператвараўся ў нязменны аклад, спаганяемы за пасведчанне на права гандлю. Канец XVIII – першую трэць XIX ст. мэтазгодна разглядаць як перыяд станаўлення асабовых прывілеяў купецтва, яго дзяржаўнага распрыгоньвання. Важкі эканамічны статус купцоў абумоўліваўся наяўнасцю пэўных грашовых сродкаў (гандлёвага капітала), атрыманых у выніку неэквівалентнага абмену, падрадавай дзейнасці, паставак, піцейных водкупаў, розных махінацый, кантрабанднага гандлю і інш. Якасныя змены ў асяроддзі купецкага саслоўя стымулявалі колькасны рост гільдыйскіх гандляроў. Аднак эканамічная актыўнасць купецтва і, перш за ўсе, гандляроў яўрэйскага паходжання, стрымлівалася супярэчлівай, недастаткова акрэсленай гандлёва-эканамічнай палітыкай расійскага ўрада [1, 8, 9].

3. Унутраны гандаль ў канцы XVIII — першай трэці XIX ст. ажыццяўляўся ў трох формах: перыядычнай (кірмашовай, базарнай), неперыядычнай (развозна-разноснай), рэгулярна-стацыянарнай (крамнай), што адпавядала ўзроўню развіцця прадукцыйных сілаў краіны. Пануючай формай таварнага абарачэння з'яўляліся кірмашы. Пераважалі кірмашы з дробным і рознічным характарам гандлю. Колькасць іх на працягу вызначанага адрэзку часу павялічвалася. Гэтаму садзейнічала няразвітасць у месцах правядзення кірмашоў стацыянарнай гандлёвай сеткі, зацікаўленасць ўдзельнікаў кірмашоў у збыце сваіх вырабаў і набыцці неабходных тавараў без пасрэднікаў, а таксама тое, што кірмашы былі вызвалены (па

ўсталяваўшайся традыцыі) ад гандлёвых пошлінаў. Паміж кірмашамі існавала ўзаемасувязь, якая з цягам часу паглыблялася.

Базары функцыянавалі ў большасці гарадоў і мястэчак Беларусі. У залежнасці ад абаротаў, колькасці ўдзельнікаў, працягласці і рэгулярнасці яны падраздзяляліся на некалькі відаў: таржок, базар, галоўны ці вялікі базар, таргі, чырвоныя таргі. Часам базары насілі спецыялізаваны характар. Іх функцыі зводзіліся да забеспячэння гараджан прадуктамі харчавання, вырабамі саматужных промыслаў, а сялян — рамеснымі і мануфактурнымі таварамі, прыладамі працы. Базары з'яўляліся адным са сродкаў мабілізацыі капіталаў дробных гандляроў і своеасаблівай візітоўкай прадукцыі той ці іншай мясцовасці.

Фарміраванне капіталістычнага ўклада ў нетрах феадалізму садзейнічала станаўленню і паступоваму развіццю рэгулярна-стацыянарнага гандлю як больш прагрэсіўнай формы таварна-грашовых адносінаў. На працягу акрэсленага перыяду лічбавыя паказчыкі крамнага гандлю выяўлялі тэндэнцыю росту. У крамах вёўся гандаль мануфактурнымі, маскацельнымі таварамі, галантарэяй, бакалеяй, соллю, мяса-рыбнымі і малочнымі прадуктамі, садавінай, агароднінай і г.д. Тавары для крамаў закупляліся непасрэдна ў вытворцаў на кірмашах і базарах, а таксама ў Маскве, Пецярбургу, на Украіне, у Прыбалтыцы.

У канцы XVIII – першай трэці XIX ст. сістэма таваразбыта мела патрэбу ў вялікай колькасці пасрэднікаў. У сувязі з гэтым у горадзе і на вёсцы трывала замацоўваецца развозна-разносная форма гандлю. Пасрэднікамі паміж пастаўшчыкамі тварнай прадукцыі і буйнымі аптовымі купцамі з'уляліся прасолы (самавозы, булыні, куратнікі і г.д.), фактары, маклеры. Развозам і разносам займаліся афені і карабейнікі, дробныя прадпрымальнікі, рамеснікі, сяляне, шынкары. Шматлікія гарадскія купцы закуплялі па сёлах і вёсках сельскагаспадарчую прадукцыю, сартавалі яе ў вялікія партыі і прадавалі аптавікам. На ўнутраным рынку Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. не існавала аб'ектыўных супярэчнасцей паміж рознымі формамі гандлю, паколькі яны ўзаемна дапаўнялі адна адну і паспяхова выконвалі функцыю па забеспячэнню таварнага абмену паміж губернямі краіны [2, 5, 6, 8].

4. У канцы XVIII – першай трэці XIX ст. землі Беларусі становяцца састаўной часткай агульнарасійскага рынка, неад'емным звяном ў сістэме міжрэгіянальнага і знешняга гандлю Расійскай імперыі. Усталёўваюцца трывалыя кантакты беларускіх губерняў з Прыбалтыкай, Маларасіяй, Новарасіяй, Цэнтральна-прамысловым, Паўднёва-заходнім, Паўночна-заходнім раёнамі. Ускосныя гандлёвыя сувязі Беларусь мела амаль што з усімі эканамічнымі раёнамі Расіі. На расійскі рынак беларускія гандляры пастаўлялі прадукты сельскагаспадарчай вытворчасці, лес і лесаматэрыялы, соль, мануфактурныя вырабы і каланіяльныя тавары з-за мяжы. Узамен везлі хлеб, лён, ільняное насенне, пяньку, лес. Гэтыя тавары ішлі ў асноўным транзітам у еўрапейскія краіны. Для мясцовага ўжытку выкарыстоўвалася прадукцыя рускіх мануфактураў і заводаў, бакалея, галантарэя, металы і г.д. Адчувальную ролю ў міжрэгіянальным і знешнім тавараабмене адыгрывалі водныя шляхі, на якіх знаходзіліся буйныя прыстані, такія як віцебская, полацкая, гродзенская, брэсцкая, пінская, стаўбцоўская і інш. [7].



## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ

**Артыкулы ў навуковых часопісах:**

1. Шаўчэня М. Прававое становішча і сацыяльны склад купецтва Беларусі ў канцы XVIII - першай трэці XIX стагоддзя //Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы. - 2000. - Сер.1. - №2 (4) - С.35-43.
2. Шаўчэня М. Кірмаш па-беларуску //Беларуская думка. - 2002. - №8. - С. 113-117.

**Матэрыялы канферэнцый:**

3. Шаўчэня М. Гандаль ў Беларусі (канец XVIII – першая трэць XIX ст.): гістарыяграфія праблемы //Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця: Матэрыялы навук. канф., прысвеч. 70-годдзю Ін-та гісторыі НАН Беларусі (Мінск, 6-7 кастрычніка 1999 г.) /М.П. Касцюк, У.І. Навіцкі, Л.М. Лыч і інш. – Мн.: "Дэполіс", 2000. – С. 170-172.
4. Шаўчэня М. Да праблемы фарміравання гандлёва-прадпрымальніцкай прасторы на землях Беларусі у канцы XVIII - першай трэці XIX стагоддзя //Шляхі развіцця інтэлекта і творчасці маладых: Матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Работа з адоранай студэнцкай і вучнёўскай моладдзю: стан, формы і метады, перспектывы развіцця" /Пад рэд. І.П. Крэня. – Гродна: ГДзУ, 2001. - С.229-234.
5. Шаўчэня М. Свіслацкі кірмаш у першай палове XIX стагоддзя //Старонкі гісторыі Свіслацкага краю: Матэрыялы навукова-практычнай краязнаўчай канферэнцыі /Пад рэд. І.П. Крэня. - Гродна: ГДзУ, 2001. - С.130-134.
6. Шаўчэня М. Мінскія кантракты: росквіт і заняпад //Шляхі развіцця інтэлекта і творчасці маладых: Матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Работа з адоранай студэнцкай і вучнёўскай моладдзю: стан, формы і метады, перспектывы развіцця" /Пад рэд. І.П. Крэня. – Гродна: ГДзУ, 2001. - С.332-336.
7. Шаўчэня М. Развіццё гандлю на Слонімшчыне ў канцы XVIII - першай палове XIX стагоддзя //Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў: Матэрыялы рэгіянальнай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 750-годдзю горада Слоніма і 70-годдзю заснавання Слонімскага раённага краязнаўчага музея ім. І.І.Стаброўскага /Складальнікі Д.С. Аляшкевіч, І.П. Крэнь; Пад рэд. І.П.Крэня. - Слонім. друк., 2002. - С.160 - 167.
8. Шаўчэня М. Трансфармацыя прававога статуса яурэйскага купецтва ў расійскім заканадаўстве апошняй трэці XVIII - першай трэці XIX стагоддзя //Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества: Материалы V международной научной конференции /Учреждение образования "Институт современных знаний" Гродненский филиал. - Гродно, 2002. -Ч2. - С.378-383.
9. Шаўчэня М. Некаторыя аспекты станаўлення купецкай прадпрымальніцкай функцыі на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. //Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця:

Матэрыялы рэспуб. навук. канф.: У 4ч. Ч.2 /Пад рэд. І.П.Крэня, У.І.Навіцкага, І.А.Змітровіча. – Гродна: ГрДУ, 2003. – С.118-126.

10. Шаўчэня М. Беларускае памежжа ў кантэксце знешнеэканамічнай палітыкі Расійскай дзяржавы (апошняя трэць XVIII – пачатак XIX ст.) //Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: Матэрыялы рэспуб. навук. канф.: У 4ч. Ч.2 /Пад рэд. І.П.Крэня, У.І.Навіцкага, І.А.Змітровіча. – Гродна: ГрДУ, 2003. – С. 126-135.



## РЭЗЮМЭ

### ШАЎЧЭНЯ МІХАІЛ МІХАЙЛАВІЧ
### РАЗВІЦЦЁ ГАНДЛЮ Ў БЕЛАРУСІ
### (КАНЕЦ XVIII – ПЕРШАЯ ТРЭЦЬ XIX СТ.)

Ключавыя словы: *гандлёвая прастора, гандлёвы баланс, гільдыі, інфраструктура рынка, рынак, тавар, тавараабарот, таможаная пошліна, таможаны тарыф, цана.*

Мэта дысертацыі: раскрыць у праблемна-храналагічным плане працэс развіцця гандлёвай сістэмы Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст.

Аб'ектам даследавання выступаюць гандлёвыя адносіны на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. У якасці прадмета даследавання разглядаецца працэс развіцця гандлёвай сістэмы беларускага рэгіёна як сукупнасці пэўных элементаў: гандлёвай прасторы, суб'ектаў гандлёвай дзейнасці, унутранага, міжрэгіянальнага і знешняга тавараабмена.

Тэарэтыка-метадалагічную аснову даследавання склалі прынцыпы аб'ектыўнасці і гістарызма. Практычным увасабленнем вышэйназваных прынцыпаў у працэсе падрыхтоўкі дысертацыі сталі агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны.

У працы ўпершыню комплексна даследаваны гандлёвыя адносіны на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. Аўтарам прапанавана мадэль гандлёвай прасторы, якая сфарміравалася ў выніку геапалітычных зменаў апошняй трэці XVIII ст.; прааналізіраваны стан і вызначаны тэндэнцыі развіцця айчыннага рынка ў разрэзе: унутраны, міжрэгіянальны і знешні тавараабмен; прапанавана трактоўка гандлёва-пасрэдніцкай дзейнасці купецтва Беларусі як ініцыятывы прадпрымальніцкага тыпу.

Высновы і палажэнні даследавання будуць садзейнічаць стварэнню цэласнай канцэпцыі айчыннай гісторыі і могуць быць выкарыстаны пры напісанні фундаментальных прац па гісторыі Беларусі, распрацоўцы адпаведных курсаў па эканамічнай гісторыі Беларусі, асабліва пры вывучэнні беларускага грамадства канца XVIII – першай трэці XIX ст.

## РЕЗЮМЕ

ШЕВЧЕНЯ МИХАИЛ МИХАЙЛОВИЧ

РАЗВИТИЕ ТОРГОВЛИ В БЕЛАРУСИ

(КОНЕЦ XVIII – ПЕРВАЯ ТРЕТЬ XIX В.)

Ключевые слова: *торговое пространство, торговый баланс, гильдия, инфраструктура рынка, рынок, товар, товарооборот, таможенная пошлина, таможенный тариф, цена.*

Цель диссертации: раскрыть в проблемно-хронологическом плане процесс развития торговой системы Беларуси в конце XVIII – первой трети XIX в.

Объектом исследования выступают торговые отношения на землях Беларуси в конце XVIII – первой трети XIX в. В качестве предмета исследования рассматривается процесс развития торговой системы белорусского региона как совокупности определённых элементов: торгового пространства, субъектов торговой деятельности, внутреннего, межрегионального и внешнего товарообмена.

Теоретико-методологическую основу исследования составили принципы объективности и историзма. Практическим воплощением вышеназваных принципов в процессе подготовки диссертации стали общенаучные и специально-исторические методы: историко-генетический, историко-сравнительный, историко-системный.

В работе впервые комплексно исследованы торговые отношения на землях Беларуси в конце XVIII – первой трети XIX в. Автором предложена модель торгового пространства, которая сформировалась в результате геополитических изменений последней трети XVIII в.; проанализировано состояние и определены тенденции развития отечественного рынка в разрезе: внутренний, межрегиональный и внешний товарообмен; предложена трактовка торгово-посреднической деятельности купечества Беларуси как инициативы предпринимательского типа.

Выводы и положения исследования будут содействовать созданию целостной концепции отечественной истории и могут найти применение при написании фундаментальных работ по истории Беларуси, разработке соответствующих курсов по экономической истории Беларуси, особенно при изучении белорусского общества конца XVIII – первой трети XIX в.





## SUMMARY

SHEVCHENYA MIKHAIL MIKHAILOVICH

THE DEVELOPMENT OF TRADE IN BELARUS

(THE END OF THE $18^{th}$ CENTURY – THE FIRST THIRD OF THE $19^{th}$ CENTURY)

Key words: *trade space, balance of trade, guild, infrastructure of market, market, goods, trade turnover, customs duty, tariff, price.*

The aim of the dissertation is to show the process of development of the trade system in Belarus in the period from the end of the $18^{th}$ century up to the first third of the $19^{th}$ century in a problem-chronological aspect.

The object of study are the trade relations on the territory of Belarus at the end of the $18^{th}$ century – the first third of the $19^{th}$ century. The object of this research work is to make a total analysis of the development of the trade system on the territory of Belarus, its trade space, subjects of the trade activity, a trade turnover between the separate regions, its domestic an foreign trade.

The principles of historism and objectivism make the theoretical and methodical base of this research. Scientific and special historical methods are used in this work such as historical genetic, historical-comparative, historical-system.

In given work are for the first time complex explored trade relations on lands of Belarus at the end of the $18^{th}$ century – the first third of the $19^{th}$ century. Author offered trade space model, which was formed as a result of geopolitical changing at last third of the $18^{th}$ century analysed condition and determined trends of development of domestic market in the cut: internal, interregional, external barter; offered interpretation of trade activity of the tradespeople in Belarus as initiatives of business type.

The conclusions and theses of this work will assist a making a holistic concept of domestic history and can be used in working out the fundamental works on history of Belarus, special courses on economic history, especially during studying of Belorusian society at the end of the $18^{th}$ century – the first third of the $19^{th}$ century.

Подписано в печать 17.07.2003. Формат 60x84/16.
Бумага Офсетная №1. Печать Офсетная. Гарнитура Таймс.
Усл. печ. л. 1,10. Тираж 85 экз. Заказ 137.

Отпечатано на технике издательского отдела Учреждения образования
«Гродненский государственный университет имени Янки Купалы».
ЛП № 111 от 29.12.2002. Ул. Пушкина, 39, 230012, Гродно